Валерый ЗІНКЕВІЧ

(г. Браслаў)

# ЖЫВАЯ АРХЕАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ: ДЗЕЙНАСЦЬ СУПОЛКІ «КРЫВІЦКАЯ АСАДА» Ў 2000 – 2006 гг.

*...сучасны эўрапеец няўмольна аддаляецца ад свайго першаснага асяроддзя: прыроды і рэальных чалавечых зносін у грамадстве. Магчыма, праз асяродкі старажытнасці многімі людзьмі будзе зроблены першы крок да разумення чалавечай існасці: мы павінны жыць у гармоніі з прыродай і іншымі людзьмі свайго грамадства* [1].

Мікола Крывальцэвіч

Напрыканцы XX стагоддзя ў еўрапейскіх краінах т.зв. жывая археалогія (аднаўленне фрагментаў побыту старажытных часоў) – далёка не толькі хоббі студэнтаў і выкладчыкаў гістарычных факультэтаў універсітэтаў, але паўнавартасная частка культурнага жыцця. Кожны крок (імпрэза, свята, фэст, прэс-канферэнцыя) аматараў жывой археалогіі выклікае шырокі грамадскі інтарэс, увагу прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і індустрыі турызму. Такія рэстаўраваныя археолагамі паселішчы старажытных кельтаў, вікінгаў, славян, палеаеўрапейцаў, як Батсэр (Вялікая Брытанія), Лейрэ, Орхус (Данія), Дзюпэль (Германія), Біскупін (Польшча) з'яўляюцца месцам для разнастайных археалагічных эксперыментаў, рэгулярных святаў і фестываляў [1]. Адным з першых доследаў у гэтым накірунку на Беларусі сталася дзейнасць спецыялістаў-музеязнаўцаў з Браслаўшчыны, распачатая імі ў XXI стагоддзі на базе Браслаўскага аб'яднання музеяў.

Адной з рэгулярных імпрэз, якую ладзіць Браслаўскае аб'яднанне музеяў, з'яўляецца штогадовае «Свята рамёстваў», змадэляванае ў традыцыях еўрапейскіх фэстаў жывой археалогіі. Каб пазбегнуць арганізацыйных праблем, заснавальнікі не сталі de jure называць яго фестывалем, але de facto яно ім з'яўляецца. Ладзім мы свята з 2002 года. Час правядзення – жнівень. Гэта тэрмін, калі традыцыйна назіраецца прыпыненне вытворчай і арганізацыйнай актыўнасці, можна адпачыць і ў сваё задавальненне сустрэцца з калегамі і аднадумцамі. Месца – пляц вакол Браслаўскага музея традыцыйнай культуры. Толькі ў 2005 годзе свята адбылася на Замкавай гары Браслава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гара яшчэ недастаткова даследавана археолагамі, таму, як прыхільнікі павагі да гістарычных мясцін, мы гэтай пляцоўкай не злоўжываем – пакуль на ёй не адбыліся грунтоўныя даследаванні, яна з'яўляецца археалагічным помнікам і патрабуе аховы і ашчадных адносінаў сучаснікаў. Пэўная ступень камернасці імпрэзы вакол музея традыцыйнай культуры нам больш да спадобы і спрыяе стварэнню настрою разняволенасці і далучэння да ўдзелу ў агульнай справе, без чаго занятк і жывой археалогіяй не маюць сэнсу. Свята традыцыйна размяшчаецца на трох пляцоўках, якія на ўвесь час правядзення працуюць сінхронна: 1)пляц народных майстроў традыцыйных рамёстваў Браслаўшчыны, традыцыя якіх не перарывалася; 2)пляц музычных калектываў, якія займаюцца рэканструкцыяй старажытнай музыкі; 3)пляц старажытных рамёстваў, традыцыі якіх рэканструяваны калектывам «жывой» археалогіі «Крывіцкая асада». Вядучы – гаспадар свята – з радыёмікрафонам перыядычна абыходзіць усе тры пляцоўкі, робіць сціплы каментар для натоўпу гледачоў, якія паступова непазбежна ўцягваюцца ў «арбіту прыцягнення» кожнай з іх. Доўжыцца гэта ўвесь дзень, і, як сведчыць трохгадовы досвед, трывала трымае ўвагу наведвальнікаў, сярод якіх штогод – прадстаўнікі ўсіх сацыяльных і ўзроставых груп Беларусі (школьнікі і супрацоўнікі ўстаноў Браслава і навакольных мясцін, вяскоўцы, працоўныя, студэнцкая моладзь, дзеячы мастацтваў, выкладчыкі і навукоўцы мінскіх і віцебскіх ВНУ).

На пляцы народных майстроў традыцыйных рамёстваў Браслаўшчыны, сярод імправізаванага кірмаша, «жыўцом» дэманструюць тэхналогію вырабу этнаграфічных прадметаў, якія дагэтуль можна было адшукаць у вясковых хатах наваколля. Накірункі вырабаў прадстаўлены: саломапляценнем (майстар Міхаіл Чэркас); лазапляценнем (майстар Міхаіл Лук'янец); ганчарствам (майстары Руслан Лабуць і Алена Жэбрык); ласкутным шыццём, ткацтвам, пляценнем паясоў, роспісам вялікодных яек (майстар Тамара Гундруль).

Пляц музычных калектываў, якія займаюцца рэканструкцыяй старажытнай музыкі, звычайна бывае запоўнены мінскімі музыкамі, якія акружаны ўдзячнымі слухачамі ці, часам, танцуючымі парамі. Гэта: гурт «Кудзьмень» (лідэр – Ірына Мазюк), удзельнікі якога дэманструюць свой досвед рэканструкцыі адзінак традыцыйнай руральнай культуры краіны – аўтэнтычных вясковых беларускіх спеваў, аднаўляюць традыцыйныя найгрышы на гармоніку і дудзе, развучваюць з гледачамі побытавыя танцы Беларусі; гурт «Стары Ольса» (лідэр – Зміцер Сасноўскі), удзельнікі якога граюць на такіх рэдкіх сёння інструментах, як дуда, шалмей, гуслі, варган і прапануюць сваю рэканструкцыю старажытнай музыкі Беларусі; выканаўца на дудзе і парных дудках Васіль Грынь; майстар народных інструментаў Алесь Лось, які выдатна валодае традыцыйнымі для руральнай беларускай культуры прыёмамі ігры на скрыпцы, вырабляе не так даўно пашыраныя на Беларусі музычныя інструменты, як колавая ліра і дуда, мелодыі для якіх неаднаразова гучалі ў яго выкананні на пляцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На пляцы старажытных рамёстваў, традыцыі якіх не дачакалі нашага часу, але рэканструяваны «Крывіцкай асадай», заўсёды бываюць прад'яўлены гледачам дэманстрацыі тэхналогій рэканструкцыі наступных кірункаў: старажытнае пісьменства, старажытная кераміка, выраб старажытных музычных інструментаў, ткацтва на вертыкальных кроснах, вытворчасць берасцяных вырабаў, разьбярства па косці, узоры старажытнай кухні. Наш калектыў, фактычна, з'яўляецца суполкай аднадумцаў, не абмежаванай нарматыўнымі дакументамі. Ён існуе з 2000 года. «Крывіцкая асада» – дыпламанты і лаўрэаты фэстаў жывой археалогіі «Biskupin» (Польшча, 2000-2005), «Volin» (Шчэцын, 2003-2005), «Kernava» (Летува, 2001-2005), «Заслаўскі набат» (Заслаўе, 2002 -2003). Слова 'asada' перакладаецца з стараславянскіх моў як «вёска», «паселішча».

У час нашых прэзентацый-перформансаў старажытных рамёстваў глядач атрымлівае магчымасць наблізіцца да ладу жыцця сваіх продкаў, пабываць у крыўскім паселішчы, патрымаць у руках рэстаўраваныя прадметы старога побыту, адчуць навобмацак і нават на густ фактуру і смак мінулага свайго краю. Кожны з удзельнікаў «асады» бярэ на сябе частку агульных арганізацыйных абавязкаў і, адначасова, з'яўляецца спецыялістам у абранай ім галіне мастацтвазнаўства і старажытных тэхналогій.

Працэс падрыхтоўкі і запісу тэкстаў з дапамогай васковых дошчачак і пісала, пашыраны хранапагічна і геаграфічна ад часоў антычнай эліністычнай цывілізацыі да XIX стагоддзя, і ад Міжземнамор'я да Ноўгарада, дэманструе Кастусь Шыдлоўскі. Тэхналогію вытворчасці ганчарных вырабаў неаліту, эпохі бронзы, эпохі ранняга жалеза і Сярэднявечча Беларусі і сумежных з беларускай тэрыторый я тлумачу і прад'яўляю асабіста ў выглядзе разнастайных керамічных прадметаў, знятых з майго ганчарнага кола і абпаленых на агні. Апошнім часам гледачы могуць азнаёміцца і з маёй інтэрпрэтацыяй вырабу ўсходнееўрапейскіх гуслей. Для іх аднаўлення былі выкарыстаны матэрыялы археалагічных раскопак сярэднявечнага Ноўгарада, матэрыялы этнографаў і мастацтвазнаўцаў XIX-XX стагоддзяў, якія даследавалі побыт беларусаў і літоўцаў.

Рэканструктару старажытных тэхналогій апрацоўкі дрэва Алесю Курбану прылады працы – тапары і нажы – рабілі польскія і летувіскія кавалі па ўзорах 10-12 стагоддзяў.

Па тэхналогіях гэтага ж перыяду ён вырабляе на вачах у гледачоў дробную пластыку і посуд з розных пародаў дрэва. На пашыраным ад Сярэднявечча да першай паловы XX стагоддзя, так званым, лучковым такарным станку Алесь точыць верацёны. На адкрытым вогнішчы ў керамічным посудзе, рэканструяваным па ўзорах неаліту, эпохі бронзы і жалеза, рыхтуюць традыцыйную ежу беларусаў – крупы, куцці, кашы, бліны, вараць крупнік – Элеанора Зінкевіч і Святлана Курбан. Іх праца – не толькі досвед рэканструкцыі і смачны пачастунак для гледачоў, але і эксперымент на надзейнасць для тэхналогій рэканструкцыі посуду. Каб посуд на агні не калоўся, тэхналогія яго вырабу мусіць быць набліжанай як мага больш да аўтэнтычнай – апрабаванай стагоддзямі. Ткацтвам на вертыкальных кроснах, першыя ўзоры якіх ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе археолагі датуюць ажно V

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тысячагоддзем да н.э. Рознымі відамі пляцення з нітак займаецца Наталля Шыдлоўская. Разам з Людмілай Пупінай яны валодаюць адмысловай старажытнай тэхнікай пляцення шкарпэтак іглой. Такая тэхніка была пашырана на Беларусі ў XI-XII стагоддзях.

Адной з цэнтральных падзей, якая надае нашым святам элемент урачыстасці і, нават, сакральнасці, з'яўляецца рытуал здабычы агню. Ён рэканструяваны «Крывіцкай асадай» па некалькіх апісаннях, найбольш вядомым з якіх з'яўляецца апісанне расійскага гісторыка Барыса Рыбакова. Ён лічыцца адным з найбуйнейшых спецыялістаў XX стагоддзя па прагісторыі Еўропы поруч з украінцам Валянцінам Даніленкам і амерыканкай летувіскага паходжання Марыей Гімбуцьене[2]. Даволі буйную драўляную прыладу, з дапамогай якой рытуал ладзяць, называюць 'svidr'. З заходнеславянскіх моў на беларускую гэта можна перакласці як «вяртак». Яе адначасова круцяць каля 6-8 чалавек і выкарыстоўваюць раз ці двойчы на год. Мяркуемы тэрмін – сакавік, калі рытуал сімвалізаваў нараджэнне сонца – агню нябёсаў. У тэкстах старажытнаіндыйскай Рыгведы Агні – касмічны, рытуальны агонь – па колькасці зваротаў саступае толькі Індры – уладару маланкі і нябёсаў [2]. Наколькі важным і глабальным меркаваўся архетып агню ў свядомасці старажытных індаеўрапейцаў (ён праходзіў праз усю будову светапарадку – ад нябёсаў да глыбінь глебы), сведчыць наступны рытуальны зварот да Агні: «Ты чистым рождён, отпрыск растений. /О Агни, твой жар в небесах, на земле, / В водах, в растеньях, ... /Жги жаром, нестареющий! ... /Храни ты нас от ужаса, / От бед, во тьме сияющий, /Неуязвимый – день и ночь!» [3]. Па меркаваннях навукоўцаў, перад пачаткам падзеі здабычы (фактычна, адраджэння) рытуальнага агню, у вёсцы паўсюль гасілі коміны, а пасля здабычы новы агонь урачыста разносілі па хатах. Мы здабытым новым агнём запальваем сваё вогнішча, на якім у час свята гатуем «старажытную» ежу, рыхтуем комін, на якім абпальваем кераміку. Для арганізатараў і ўдзельнікаў «Свята рамёстваў» агонь, здабыты свідрам – сімвал повязі часоў, вернасці традыцыям і запаветам крывіцкай культуры.

В ы с н о в ы з дзейнасці «Крывіцкай асады» за апошнія гады варта зрабіць наступныя.

- Запатрабаванымі і жыццяздольнымі ў XXI ст. будуць музейныя калектывы, якія акрамя збору і каталагізацыі артэфактаў маюць здольнасці і магчымасці для іх творчай, відовішчнай рэпрэзентацыі.
- Сэнс дзейнасці музееў – захаванне помнікаў культуры – з дапамогай жывой археалогіі можа быць пашыраны ад музеефікацыі артэфактаў да адраджэння народных рамёстваў, жанраў фальклору.

**Л і т а р а т у р а**


1. Крывальцэвіч, М. Жывая архіялёгія / М. Крывальцэвіч // Крывальцэвіч, М. Археалягічныя адкрыцці сьвету. – Мінск : Athenaeum, 2000. – С. 48 – 61.
2. Шилов, Ю.А. От издателей / Ю.А.Шилов // Начала цивилизации. – Екатеринбург : Деловая книга; М. : Раритет, 1999. – С. 5 – 6.
3. Элиаде, М. Гимны Агни / М.Элиаде // Элиаде М. Священные тексты народов мира / М.Элиаде; пер. с англ. В.Федорина. – М. : Кронпресс, 1998. – С. 274 – 276.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ